Ефціфеева, Н. Мой лёс — кнігі / Наталля Ефціфеева // Культура. – 2019. – 20 красавіка (№16). – С. 6.

Кніга ў жыцці паэткі, выдаўца, журналісткі, бібліятэкара Н. Ефціфеевай (Кандрашук).

Прэм'ера рубрыкі

Можна было б назваць гэтую рубрыку «Як прайсці ў бібліятэку?» Можна было б — гадоў пяць — дзесяць таму. На сёння пытанне яўна састарэла. Дзе знаходзіцца галоўная « кніжкіна » ўстанова, цяпер ведае бадай кожны. А вось чым там заняцца наведвальніку, каб да чытання прызвычаіцца? Над гэтым пытаннем і бібліятэкары часам задумваюцца. Інакш кажучы, нам патрэбна пляцоўка для абмену думак паміж бібліятэкарамі, паміж чытачамі, паміж першымі і другімі. Давайце назавём яе Воок Сго ssing . Гэта і кнігазварот, і грамадскі рух, і, урэшце, — хобі для душы. А у нашым выпадку — дыскусійная прастора, прысвечаная развіццю бібліятэчнай справы. Прапанаваў

сваю
ідэю
—
вазьмі пакарыстацца
задумай
іншага.

Мой лёс — кнігі

Чытаць я навучылася ў чатыры гады і ў свой час стала самым юным чытачом Камянюцкай сельскай бібліятэкі Камянецкага раёна. Памятаю
здзіўленыя
вочы загадчыцы,
калі
мой тата
сказаў,
што на
пяцігадовую дзяўчынку трэба завесці фармуляр і яна будзе выбіраць кніжкі самастойна.
«
Хіба
яна
ўмее
чытаць?» — «Умее»,
—
пацвердзіў
бацька. А я тым часам ужо
хадзі
ла
паміж стэлажоў.
Не магу
ўспомніць,
якой была мая першая
кніга,

але на
ўсё
жыццё
ў памяці
захавалася фраза
бібліятэкара:
«Гэта для яе яшчэ рана, яна не зразумее». І тут за мяне
«
заступіўся
»
брат:
«
Зразумее. Яна
такія кнігі ўжо
чытае». Як пасля высвет
лілася, кніга
была
разлічана
на дзяцей
гадоў дзесяці.

Хто бы мог тады падумаць, што з кнігамі і бібліятэкай будзе звязана ўсё далейшае жыццё.

У нашай сям'і ўсе любілі чытанне, тым не менш, мяне ніхто не вучыў чытаць мэтанакірава на. Але, калі надыходзіў вечар і ў руках маіх родных з'яўлялася кніга, газета або часопіс, мне міжволі хацелася далучыцца да іх. Я чаплялася да дарослых з пытаннем:
«
Якая гэта літара?
»
Прачытванне першых складоў і слоў выклікала бурлівую радасць.

Прайшоў літаральна год ці два, і мама звольнілася з Музея прыроды, дзе працавала экскурсаводам, і стала бібліятэкарам. Адгэтуль у бібліятэцы я бывала ўсё часцей. Прычым з цягам часу навучылася

з
апаўнядь фармуляры, расстаўляць правільна кнігі на паліцы, прымала ўдзел у мерапрыемствах, дапамагала маме пісаць сцэнарыі, афармляць тэматычныя папкі, выставы і рабіць справаздачы, калі яна
ўжо стала загадч
ыц
ай.

А яшчэ ў бібліятэцы з'явілася мая асабістая папка, бо я з 11 гадоў пісала вершы, а з 14 друкавалася ў газетах і часопісах. Праз гады ў «роднай» бібліятэцы адбылася прэзентацыя маёй першай кнігі
«
Зимний букет».

У час вучобы ва ўніверсітэце ў Брэсце я была нязменным чытачом як універсітэцкай, так і абласной бібліятэкі. Пераехаўшы ў Кобрын, і тут пасябравала з цэнтральнай раённай бібліятэкай, але не толькі ў якасці чытача, а яшчэ як паэт і журналіст. З часам усталяваліся цёплыя сяброўскія адносіны із Брэсцкай цэнтральнай гарадской бібліятэкай.

У дзяцінстве я марыла пісаць і выдаваць кнігі, і гэтым смелым марам наканавана было сп раўдзіц
ца. Спачатку да выдання
кніг
я стала датычная працуючы
ў рэдакцыі часопі- саў,
а
ў
2016 годзе атрымала пасведчанне
в
ыдаўц
а
як
індывідуальны
прад
прымальнік.

Калі мы не здраджваем дзіцячай мары і засяроджана, настойліва ідзем да мэты, то Бог

часам дае больш за тое, што мы просім. Жыццёвыя пуцявіны прывялі мяне ў бібліятэку ў новай
якасці. Я прыйшла ў Кобрынскую
РЦБС на работу —
бібліятэкарам
у аддзел маркетынгу. Вось дзе
спатрэбіўся
атрыманы
ў дзяцінстве
вопыт. І хоць я не
запаўняю
чыта
цкія
фармуляры
і
не расстаўляю на
паліцах кнігі,
але мне неабходна ведаць, як гэта
робіцца правільна. Дый журналісцкія і выда- вецкія навыкі выявіліся не лішнімі. Шмат чаму вучуся і ў чарговы раз разумею: мой лёс — кнігі.

Наталля ЕФЦІФЕЕВА

Кобрын